# Так будавалася наша чыгунка

СПАЧАТКУ хачу нагадаць, што ўпершыню чыгункі пачалі будаваць у Англіі. Рух па іх пачаўся з 1829 года. У Расіі першая — Царскасельская чыгунка — была адкрыта ў 1838 годзе. Пасля адмены прыгоннага права, калі ў краіне пачаўся значны па таму часу прамысловы ўздым, патрэба ў такіх дарогах рэзка ўзрасла, і царскі ўрад стаў садзейнічаць паскарэнню іх будаўніцтва.

Аднак, не маючы дастатковых сродкаў, царскі ўрад вымушан быў звярнуцца да прыватных прадпрыймальнікаў. У выніку ўзнікла таварыства з рускіх і замежных капіталістаў на чале з прыдворным банкірам — баронам Шчыгліцам. Іменна гэтаму таварыству, якое называлася тады галоўным таварыствам расійскіх жалезных дарог, і было даручана будаўніцтва чыгункі Масква — Варшава (цяпер Беларуская чыгунка).

У нашай мясцовасці будаўніцтва чыгункі пачалося ў вельмі цяжкі для сялян час. Старыя людзі Кандрат Амельянюк і Сямён Салей, якія жылі ў той час, часта расказвалі сваім дзецям і ўнукам пра тое горкае жыццё. Абрабаваныя памешчыкамі пасля рэформы 1861 года сяляне зусім збяднелі. У іх не заўсёды ўдосталь было нават грубых даматканых сярмяг, каб апрануцца. Хлеб пяклі напалавіну з паловай. Жылі ў пахілых закураных хатках з малюсенькімі падслепаватымі акенцамі. Часам у хаце разам з людзьмі зімавала карова з цялём ці авечка.

Да такой галечы людзей даводзілі непамерныя выплаты памешчыкам за зямлю. А дзе ж было ўзяць грошы на тую плату, калі заробкаў ніякіх да таго, як пачалося будаўніцтва чыгункі, паблізу не было. Памешчыкі ж толькі здзекліва пасмейваліся з сялян: «Цяпер вы свабодныя, самі сабе гаспадары. Дык ці можа быць вам дрэнна? А ўрэшце ведайце, які смак жыць без панскай ласкі...»

Вось гэтая адчайная беднасць і пагнала мясцовых сялян шукаць выйсця ў заробках на будаўніцтве чыгункі. Толькі рэдка хто маламальскі выбіўся з бяды.

Успамінаю, што расказваў аб непасільнай і дрэнна аплочваемай працы на чыгунцы стары Якаў Мацвеевіч Андрасюк з вёскі Грыцэвічы. Ён доўгі час працаваў на будаўніцтве чыгункі, нямала перанёс сам і яшчэ больш наглядзеўся на пакуты людзей, якія прыходзілі сюды з надзеяй крыху папрaвіць матэрыяльнае становішча сваіх сем'яў.

На шляху будаўнікоў сустракалася нямала балот, рэчак. Часам прыходзілася цэлымі днямі працаваць па калені, а то і па пояс у вадзе, высякаючы дрэвы і хмызняк. Выраўноўвалі зямлю, падсыпалі і падбівалі пад шпалы баласт, падымалі і пераносілі рэйкі... І ўсё гэта ўручную, пры дапамозе лапаты, тачкі і ўласных мускулаў, без малейшай механізацыі. Адзінымі памочнікамі на знясільваючай рабоце былі коні. Ды з возам не ўсюды можна было праехаць.

Дзесятнікі, кіраваўшыя пракладкай чыгуначнага палатна, патрабавалі ад рабочых высокай выпрацоўкі і не менш, чым паны, здзекаваліся з безабаронных людзей. А плацілі кожнаму не больш як 50 капеек за дзень.

На падрыхтоўцы насыпу і чыгуначнага палатна працавала шмат рускіх рабочых са Смаленскай губерні. Яны мелі некаторы вопыт у гэтай справе і падказвалі людзям з нашай мясцовасці, што і як рабіць. Укладвалі ж шпалы і насцілалі рэльсы немцы. Лічылася, што гэта надта складаная работа для непісьменных беларускіх мужыкоў.

Станцыю было запланавана будаваць у фальварку Жабінка. Цяпер гэтае месца завуць Малой Жабінкай. Да 1863 года фальварак належаў памешчыку Трымбіцкаму, які быў адначасова ўладальнікам маёнтка Плошча паблізу вёскі Мацаевічы. Але Трымбіцкі за актыўны ўдзел у паўстанні 1863 года быў арыштаваны і сасланы на катаргу. Яго ж зямельныя ўладанні перадалі дзяржаўнаму банку для продажу.

Асноўную частку фальварка Малая Жабінка купіў нейкі Васілеўскі. Ён стаў настойліва хадайнічаць перад адпаведнымі ўладамі аб адмене гэтага плана будаўніцтва станцыі. І ўрэшце рэшт яго просьба была задаволена.

Тады рашылі будаваць станцыю на зямлі, якая належала сялянам вёскі Абрамавічы. Яны ж не маглі выкруціцца і захаваць свае ўчасткі так, як Васілеўскі. На зямлі селяніна Навіцкага быў збіты з дошак невялічкі барак, які часова замяняў вакзал. На ім прыбілі шыльду: «Станцыя Жабінка». Гэтая назва захавалася, відаць, ад першапачатковага праекта, прывязанага да фальварка Жабінка. У тым жа 1871 годзе па чыгунцы пайшлі першыя паязды.

Вось з гэтага барака, пабудаванага сто гадоў назад на чыгунцы Масква — Варшава, і пачынаецца гісторыя нашага цяперашняга раённага цэнтра.

Але падрабязней аб гэтым я раскажу ў наступным артыкуле.

Няма ўжо сведкаў і ўдзельнікаў падзей векавой даўнасці, але некаторыя факты перадаюцца з пакалення ў пакаленне, не гаснуць у людской памяці. Захаваліся ў мяне некаторыя даныя: выпіскі, старыя падручнікі гісторыі, звесткі з якіх аб нашай мясцовасці я выкарыстоўваю ў артыкулах.

**П. ФІЛІПУК,**
**былы выкладчык гісторыі, пенсіянер.**
Вёска Малыя Сяхновічы.